# МАРАЛЬНЫ ВЫБАР

***В. І. Локун.*** **Маральна-філасофскія пошукі беларускай ваеннай і гістарычнай прозы: 1950 — 60-я гады. — Мн., 1995. — 109 с.**

Пры аналізе развіцця сучаснага літаратурнага працэсу нельга не заўважыць, якой велізарнай штучнасцю патыхае ад многіх сённяшніх навапошукаў, часам абсурдных да неверагоднасці новаўтварэнняў. Праўда, у аўтараў-«бумбамлітаўцаў» (справа не толькі ў руху «Бум-Бам-Літ», але і ў ім таксама, у яму падобных) ёсць як быццам апраўданне: новае нічым не можа быць падобнае на старое. І, дарэчы, права на вялікі эксперымент (які, між іншым, і для таленавітых «бумбамлітаўцаў» у хуткім часе скончыцца) дае характар дня сённяшняга — што значыць само заканчэнне веку? Ды толькі, кажучы словамі Ёгана Бехера, «новае мастацтва ніколі не пачынаецца з новых форм, новае мастацтва нараджаецца з новым чалавекам». Відаць, таму і сімпатычныя, блізкія, дагэтуль зразумелыя нам, героі нашай літаратуры 50—60-х гг. Таму, пэўна, і ілюстрацыяй для размовы пра маральнасць літаратурнага персанажа Валянціна Локун абрала беларускую прозу 50—60-х гг. Пры гэтым самою назвай удакладніла абсягі і аналізу, і выбару прадмета: «Маральна-філасофскія пошукі беларускай ваеннай і гістарычнай прозы».

Пагаджаючыся са стаўленнем Ё.Бехера да змен у мастацтве і жыцці, Валянціна Локун удакладняе залежнасць новапрацэсаў у літаратуры ад зямных рэалій: «... прынцыповыя змены ў мастацтве пачынаюцца яшчэ са з'яўленнем новых адносін паміж чалавекам і рэчаіснасцю, чалавекам і грамадствам». І далей сцвярджае: «Такім чынам, асноўным суб'ектам руху літаратуры і мастацтва з'яўляецца чалавек грамадскі з яго зменлівымі адносінамі да навакольнага свету. Такі падыход да праблемы руху літаратуры, думаецца, найбольш мэтазгодны, бо ён разглядае літаратурны працэс як сістэму аб'ектыўна-суб'ектыўных адносін, як цэласны арганізм, у якім складана ўзаемадзейнічаюць новае і старое, традыцыі і наватарства».

Валянціна Локун, канешне ж, нездарма ўзялася за разгляд маральна-філасофскіх пошукаў менавіта на прыкладзе беларускай прозы 50—60-х гг. Якраз там — пачатак нас сённяшніх. Пры ўсёй павазе да літаратуры 20—40-х усё ж трэба засведчыць пра пэўную яе адасобленасць, справакаваную грамадска-палітычным,

дзяржаўным, антычалавечым па сутнасці механізмам сістэмы, ад агульнага шляху да беларускасці, беларускай свядомасці.

Тры раздзелы складаюць даследаванне В.Локун. Першы — «Праблема гуманізму і маральны выбар героя», другі — «Характары і падзеі ў святле філасофіі чалавечнасці», трэці — «Пошук сучаснага маральнага ідэалу ў мінулым. Гістарычная проза У.Караткевіча». Уважлівы аналіз літаратуразнаўцы найперш (гэта датычыцца прозы Івана Шамякіна, Івана Навуменкі, Алеся Адамовіча, Янкі Брыля, Івана Пташнікава) скіраваны на разгляд светапогляду галоўных герояў, як правіла, юных герояў, якім свет, псіхалогію быцця яшчэ пазнаваць і пазнаваць. Ды ўнутраны рух, тэндэнцыя да пазнання ў Міці Птаха, Толі Корзуна, Алеся Руневіча маюць надзвычайнае паскарэнне. І яно зусім не штучнае, зададзенае мастакамі слова. А хутчэй — лагічнае, абумоўленае вайною, псіхалагічна пераканальна перададзенае пісьменнікамі. У лепшых творах пра вайну, як правіла, аўтарамі робіцца спроба паказаць складаны ўнутраны свет чалавека-адзінкі. Але было ў гэтай літаратуры і іншае. В.Локун далікатна канстатуе гэты факт напрыканцы першага раздзела: «Катэгорыя выбару неад'емная ад катэгорый трагічнага і гераічнага. Але як катэгорыя маральнасці чалавека ў партызанскай прозе яна мае адметнае значэнне ў тым плане, што носіць больш абагульнены характар, бо раскрывае не столькі подзвіг аднаго чалавека, колькі подзвіг «калектыўны», усяго народа, да таго ж яна цесна звязана з катэгорыяй нацыянальнага — унутраным супраціўленнем простага народа, нацыі ў цэлым супраць знешняга насілля». Тут літаратуразнаўца як быццам дазваляе апусціць агульную планку ў вызначэнні мастацкай сутнасці літаратуры.

Увогуле, на наш погляд, — і гэта асабліва адчувальна пры чытанні другога раздзела кнігі — аўтар ідэалізуе пытанне абавязкаў чалавека. Бясспрэчна, абавязкі, спрадвечнае імкненне вынайсці мяжу паміж уласным «я» і грамадствам, калектывам, сям'ёй — гэта і ёсць сутнасны стрыжань жыцця. Ды толькі не заўсёды ў гэтым жыцці ўсё так адназначна, як сцвярджае пісьменніца: «Праблема выбару як праблема грамадзянскага і воінскага абавязку трансфармавалася ў катэгорыю маральную і набыла статус унутранага пабуджальнага імпульсу, статус сумлення». Часам філасофія існавання заключана ў больш вузкіх межах, калі і абавязкі, і сумленне, і ўласныя жаданні — усё гэта заложнікі ўласнага «я». Бачыць гэта ў жыцці, пісаць пра гэта, аналізаваць гэта на рэальных, а не прыдума-

ных прыкладах — ці ж не з'яўляецца ўсё гэта адначасна і задачай крытыкі?

Гістарычная проза У.Караткевіча дала падставу для разгляду маральнага ідэалу ў мінулым. Дакладней — пошуку сучаснага маральнага ідэалу ў мінулым. Канечне ж, творы У.Караткевіча сучасныя. Ужо хаця б таму, як справядліва зазначае В.Локун, што празаік імкнуўся «адлюстраваць працэс станаўлення і развіцця нацыянальнай свядомасці, адлюстраваць жыццё беларускага народа ў яго рэвалюцыйным развіцці». Караткевіч усё ж такі рамантык. Рамантык у адлюстраванні мінуўшчыны, рамантык у спраўджванні маральнасці. Ці да такой ступені рамантычнае і ідэалістычнае ёсць наша жыццё? У тым ліку — жыццё народа ў мінулым? Думаецца, пры аналізе твораў У.Караткевіча трэба больш аб'ектыўна ставіцца да абуджанай мастаком сівой мінуўшчыны. Аднак высноваў, накшталт наступнай, зробленых В.Локун, для сапраўднага аналізу творчасці нашага класіка недастаткова: «Праз мастацтва адбываецца ў чалавека і далучанасць да магутнай энергіі продкаў. Бо яно ўпітвае ў сябе геній усяго чалавецтва і гэтым аказвае ачышчальны ўплыў на душы пакалення». Гэта ўсяго толькі агульная схема.

Як і ў першых двух раздзелах, так і ў трэцім аўтар даследавання закранае праблему эстэтычнага вымярэння маральна-філасофскіх пошукаў літаратуры. Таму, пэўна, у высновах літаратуразнаўцы і пераважае клопат пра прыгожае. Але ж ці дрэнна гэта? Галоўнае — у эстэтычным пошуку не згубіць адчуванне «зямлі пад нагамі».

Алесь КАРЛЮКЕВІЧ